# Статьи

# Артыкулы

# Articles

*УДК 94(476:4-470)“1921/1933”*

## ДЗЕЙНАСЦЬ УЗГАДНЯЛЬНЫХ КАМІСІЙ ПА ЛІКВІДАЦЫІ ПАГРАНІЧНЫХ ІНЦЫДЭНТАЎ НА БЕЛАРУСКІМ УЧАСТКУ САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ ГРАНІЦЫ (1921–1933)

*В. М. БАРОЎСКАЯ*

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі,*
*вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле аналізуецца дзейнасць узгадняльных камісій па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў на беларускім участку савецка-польскай граніцы ў 1921–1933 гг. (падкамісіі Мінска-Нясвіжская, Полацка-Вілейская, Палеская). Падкрэсліваецца, што паралельная праца змешаных узгадняльных і пагранічнай камісій у 1921–1922 гг. пазітыўна адбівалася на працэсах дэлімітацыі і дэмаркацыі. Аднак нізкая эфектыўнасць працы ўзгадняльных камісій (75 % заяў-пратэстаў засталіся без станоўчага адказу), немагчы-

**Образец цитирования**:
Бароўская, В. М. Дзейнасць узгадняльных камісій па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў на беларускім участку савецка-польскай граніцы (1921–1933) / В. М. Бароўская // Граница и пограничье. – 2025. – № 2 (8). – С. 7–21.

**For citation**:
Borovskaya V. M. Activities of conciliation committees for resolving border incidents on the Belarusian section of the Soviet-Polish border (1921–1933). Border and Frontier. 2025. No. 2 (8). P. 7–21. Belarusian.

**Аўтар**:
***Бароўская Вольга Мікалаеўна*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”

**Author**:
***Borovskaya Volha M.*** – PhD (history), leading researcher of Institute of History of National Academy of Sciencies of Belarus;
e-mail: borovskaya-olga@mail.ru

масць прыйсці да кампраміснага варыянта пры ліквідацыі пагранічных канфліктаў патрабавалі ад савецкага і польскага кіраўніцтва выпрацоўкі новай узгадняльнай схемы. У рамках двухбаковых пагадненняў і канвенцый 1925 і 1932–1933 гг. быў замацаваны механізм урэгулявання інцыдэнтаў на савецка-польскай граніцы. Прасочваецца ўзаемаўплыў савецкай тактыкі “актыўнай разведкі” 1921–1925 гг. на працэс нармалізацыі становішча на беларускім участку савецка-польскай граніцы. Адмова ад правядзення ваеннадыверсійных акцый на памежжы, а разам з ім і агульнае пацяпленне ў двухбаковых адносінах аўтаматычна далі штуршок да актывізацыі савецка-польскіх перагавораў па вырашэнні пытанняў пагранічных канфліктаў і аптымальнага стану пагранічнай бяспекі. У выніку ўсе дробныя пагранічныя канфлікты гаспадарча-бытавога характару вырашаліся на месцы начальнікам пагранічнага атрада ДПУ (АДПУ) СССР і старастам адпаведнага павета Польшчы ці ўпаўнаважанымі асобамі.

***Ключавыя словы***: узгадняльная камісія, падкамісіі, пагранічны інцыдэнт, дэлімітацыя, дэмаркацыя, савецка-польская граніца, актыўная разведка.

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ СОГЛАСИТЕЛЬНЫХ КОМИССИЙ ПО ЛИКВИДАЦИИ ПОГРАНИЧНЫХ ИНЦИДЕНТОВ НА БЕЛОРУССКОМ УЧАСТКЕ СОВЕТСКО-ПОЛЬСКОЙ ГРАНИЦЫ (1921–1933)

*О. Н. БОРОВСКАЯ*

*Институт истории НАН Беларуси,*
*ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь*

В статье анализируется деятельность согласительных комиссий по решению пограничных инцидентов на белорусском участке советско-польской границы в 1921–1933 гг. (подкомиссии Минско-Несвижская, Полоцко-Вилейская, Полесская). Подчеркивается, что параллельная работа смешанных согласительных и пограничной комиссий в 1921–1922 гг. позитивным образом отразилась на процессах делимитации и демаркации. Однако низкая эффективность согласительных комиссий (75 % заявлений-протестов остались без положительного ответа), невозможность прийти к компромиссному варианту при ликвидации пограничных конфликтов требовали от советского и польского руководства выработки новой согласительной схемы. В рамках двусторонних соглашений и конвенций 1925 и 1932–1933 гг. был закреплен механизм урегулирования инцидентов на советско-польской границе. Прослеживается взаимовлияние советской тактики «активной разведки» 1921–1925 гг. на процесс нормализации положения на белорусском участке советско-польской границы. Отказ от проведения военно-диверсионных акций на пограничье, а вместе с тем и общее потепление двусторонних отношений автоматически подтолкнули к активизации советско-польских переговоров по решению вопросов пограничных конфликтов и оптимального состояния пограничной безопасности. В итоге все мелкие пограничные конфликты хозяйственно-бытового характера решались на месте начальником пограничного отряда ГПУ (ОГПУ) СССР и старостой соответствующего повета Польши или уполномоченными ими лицами.

***Ключевые слова***: согласительная комиссия, подкомиссии, пограничный инцидент, делимитация, демаркация, советско-польская граница, активная разведка.

# ACTIVITIES OF CONCILIATION COMMITTEES FOR RESOLVING BORDER INCIDENTS ON THE BELARUSIAN SECTION OF THE SOVIET-POLISH BORDER (1921–1933)

*O. N. BOROVSKAYA*

*The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Academic str., 1, 220072, Minsk, Belarus*

The article analyzes the activities of the conciliation commissions for resolving border incidents on the Belarusian section of the Soviet-Polish border in 1921–1933 (the Minsk – Nesvizh, Polotsk – Vileyka, and Polesskaya subcommissions). It is emphasized that the parallel work of the mixed conciliation and border commissions in 1921–1922 had a positive impact on the processes of delimitation and demarcation. However, the low efficiency of the conciliation commissions (75 % of the protest statements were not answered positively), as well as the inability to reach a compromise solution to resolve border conflicts, required the Soviet and Polish leadership to develop a new conciliation scheme. The bilateral agreements and conventions of 1925 and 1932–1933 established a mechanism for resolving incidents on the Soviet-Polish border. The Soviet "active reconnaissance" tactics of 1921–1925 had a significant impact on the process of normalizing the situation on the Belarusian section of the Soviet-Polish border. The abandonment of military and sabotage operations in the border region, as well as the general warming of bilateral relations automatically led to increased Soviet-Polish negotiations on resolving border conflicts and ensuring optimal border security. As a result, all minor border conflicts of an economic and domestic nature were resolved on the spot by the head of the border detachment of the State political Administration (United State Political Administration) of the USSR and the head of the relevant Polish district or their authorized persons.

***Keywords***: conciliation commission, sub-commissions, border incident, delimitation, demarcation, Soviet-Polish border, active exploration.

## Уступ

Цікавасць да праблемы выканання ўмоў Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г., у прыватнасці да пытання ўстанаўлення савецка-польскай граніцы ў 1921–1922 гг. і вырашэння пагранічных канфліктаў паміж бакамі, праявілася ў канцы 1960-х гг. – пачатку 1970-х гг. у працах як савецкіх (П. Н. Альшанскі [1]), так і польскіх даследчыкаў (Е. Куманецкі [2]). Абодва гісторыкі разглядалі працэсы дэлімітацыі і дэмаркацыі ў рамках прац змешанай пагранічнай камісіі, без уліку мясцовай спецыфікі, ролі беларускіх савецкіх органаў кіравання ў гэтых працэсах. У сучаснай польскай гістарыяграфіі неабходна адзначыць даследаванні З. Кавальскага [3], А. Пачобута [4], А. Васілеўскага [5], у беларускай гістарычнай навуцы – працы С. М. Хоміча [6], В. М. Кузьміч [7]. Праблема ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў паўставала як складаючая частка савецка-польскіх адносін 1921–1939 гг. Пры гэтым нявырашанымі ў гістарыяграфіі застаюцца пытанні, звязаныя з дзейнасцю расійска-украінска-беларускіх дэлегацый ў змешаных камісіях на тэрыторыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь (ССРБ), без адказу на якія нельга апісаць працэс тэрытарыяльнага размежавання паміж савецкімі рэспублікамі і Польшчай. Дзейнасць змешанай узгадняльнай камісіі па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў у 1921–1933 гг. не станавілася аб’ектам самастойнага даследавання, што часткова можна патлумачыць слабай забяспечанасцю крыніцамі ці іх цяжкадаступнасцю.

Мэта даследавання – раскрыць дзейнасць узгадняльных камісій па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў на беларускім участку савецка-польскай граніцы ў 1921–1933 гг. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна было вы-

рашыць наступныя задачы: 1) ахарактарызаваць працу змешаных узгадняльных падкамісій па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў (Мінска-Нясвіжская, Полацка-Вілейская, Палеская) у 1921–1922 гг.; 2) прааналізаваць працэсы падрыхтоўкі і падпісання савецка-польскага пагаднення па вырашэнні спрэчных пагранічных пытанняў у 1923–1925 гг.; 3) вывучыць асаблівасці заключэння "Дамовы паміж СССР і Польскай Рэспублікай аб прававых адносінах на дзяржаўнай граніцы" ад 10 красавіка 1932 г. і канвенцыі аб парадку расследвання і вырашэння пагранічных канфліктаў.

Мэта і задачы навуковага даследавання абумовілі выкарыстанне розных метадаў і падыходаў. Метадалагічную аснову склалі асноўныя прынцыпы гістарычнага спазнання і даследавання: гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці, усебаковасці, каштоўнаснага падыходу. Пры вырашэнні пастаўленых задач выкарыстоўваліся агульнанавуковыя метады. Сярод гэтай групы неабходна вылучыць агульныя лагічныя прыёмы: аналіз і сінтэз, індукцыю і дэдукцыю, параўнанне, абагульненне, аналогію, абстракцыю. Да спецыяльных гістарычных метадаў, выкарыстаных падчас працы, адносяцца: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, структурна-дыяхранічны, рэтраспектыўны.

Асноўныя крыніцы па праблеме прадстаўлены матэрыяламі афіцыйнага справаводства органаў сістэмы кіравання БССР, РСФСР – СССР, Польшчы, актавымі крыніцамі. Яны захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Занальным дзяржаўным архіве ў г. Маладзечна, Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці, Архіве новых дакументаў у Варшаве [8–28]. У фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь актуальнымі для даследчыкаў савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду з'яўляюцца матэрыялы фондаў 4п (ЦК КП(б)Б), 6 (Цэнтральны выканаўчы камітэт (ЦВК) БССР), 34 (Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС) БССР), 48 (Народны камісарыят земляробства (Наркамзем) БССР). У іх утрымліваецца перапіска расійска-ўкраінска-беларускай дэлегацыі змешаных узгадняльных камісій з органамі кіравання БССР, статыстычны і картаграфічны матэрыял, справаздачы старшынь валасных і павятовых камітэтаў, накіраваных ў ЦВК БССР, і іншыя. У фондах Архіва новых дакументаў у Варшаве ўяўляюць цікавасць стэнаграмы і пратаколы пасяджэнняў змешаных узгадняльных камісій, інструкцыі Міністэрства замежных спраў (МЗС) Польшчы, дыпламатычная перапіска, справаздачы, аналітычныя матэрыялы. У Архіве знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі крыніцы па вывучаемай праблеме ўтрымліваюцца ў фондзе 0188/188 (Калегія Народнага камісарыята замежных спраў (НКЗС) СССР. Яна прадстаўлена перапіскай членаў Калегіі з членамі Палітбюро Цэнтральнага камітэта (ЦК) Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) – Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) (РКП(б) – УКП(б), паўнамоцнымі прадстаўнікамі (паверанымі ў справах) Польшчы ў РСФСР – СССР па пытаннях урэгулявання пагранічных інцыдэнтаў.

## Асноўная частка

**Праца змешаных узгадняльных камісій па вырашэнні пагранічных інцыдэнтаў у 1921–1922 гг.** Акрэсленая ва ўмовах Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. лінія размежавання паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай, з другога, была кампрамісным варыянтам вырашэння тэрытарыяльных спрэчак. Польскі бок часткова адмаўляўся ад федэралісцкай канцэпцыі, а савецкі – ад ідэй сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Нягледзячы на падпісанне мірнага дагавора і спыненне ваенных дзеянняў, двухбаковыя адносіны заставаліся абвостранымі. Абодва бакі да 1925 г. выкарыстоўвалі ваенна-дыверсійныя сродкі супраць суперніка з мэтай дэстабілізацыі яго ўнутранага становішча і стварэння напружанасці на паграніччы. Адсутнасць сталай савецка-польскай граніцы да канца 1922 г. і належнай пагранічнай аховы пераводзіла прыгранічныя тэрыторыі ў становішча напаўваенных.

Устанаўленне сталай савецка-польскай граніцы ў 1921–1922 гг. адбывалася на аснове артыкула II дагавора і Дадатковага пратакола ад 21 лютага 1921 г. Імі прадугледжвалася стварэнне змешанай пагранічнай камісіі (ЗПК). Аднак дзейнасць камісіі суправаджалася складанасцямі знешняга і ўнутранага характару.

Праблемы па наладжванні добрасуседскіх сувязей паміж бакамі (абмен дыпламатычнымі карпусамі), існаванне так званага палітычнага бандытызму на пагранiччы, нежаданне выконваць умовы Рыжскага дагавора на практыцы станавіліся прычынамі затрымкі працы камісіі. У сваю чаргу, для дэмаркацыі граніцы патрабавалася прыцягненне высокапрафесійных спецыялістаў, экспертаў-картографаў, якія павінны былі сабраць або падрыхтаваць неабходны для працы картаграфічны матэрыял.

У працэсе дэмаркацыі савецка-польскай граніцы ўзнікаў шэраг складанасцяў, выкліканых непаразуменнямі прыватнага характару (збор насельніцтвам прыгранічнай паласы ўраджаю на сенажацях і пашах, якія апынуліся па другі бок граніцы, эвакуацыя маёмасці, вырубка лясоў). Супрацоўнікі абедзвюх дэлегацый змешаных пагранічных камісій вымушаны былі ўлічваць патрабаванні мясцовага насельніцтва, якое ў большасці сваёй выказвала незадавальненне працэсам дэмаркацыі, асабліва аддзяленнем пасяўных і пашавых тэрыторый ад населеных пунктаў.

Найбольш спрэчныя пытанні былі перададзены на разгляд у змешаныя узгадняльныя камісіі па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў (ЗУК), праца якіх знаходзілася ў непасрэднай сувязі з працай органаў кіравання ССРБ – БССР. Так, 27 ліпеня 1921 г. на пасяджэннях ЗПК было прынята кампраміснае рашэнне аб засяванні пашаў, дзяржаўная прыналежнасць якіх яшчэ не была дакладана вызначана. Было вырашана, што на ўчастках, дзе дзяржаўная граніца была ўсталявана, слупы і пункты пагранічнай аховы былі замацаваны, абодва бакі гарантавалі права на збор ураджаю тым, хто распахаў зямлю, незалежна ад таго, дзе знаходзіўся той надзел, на ўсход або на захад ад усталяванай пагранічнай лініі.

Паралельна з працамі ЗПК распачалі сваю працу ЗУК, створаныя 1 чэрвеня 1921 г. упаўнаважанымі ўрадаў РСФСР, БССР, УССР і Польшчы ў Мінску. Былі вызначаны пяць участкаў дзейнасці асобных падкамісій (у БССР: Мінск – Нясвіж, Полацк – Вілейка, Тураў – Жыткавічы). Камісіі па заяве аднаго з бакоў збіралі фактычны матэрыял, які тычыўся пагранічнага інцыдэнта, праводзілі следства на сваёй тэрыторыі і выносілі рашэнні, якія з'яўляліся абавязковымі і канчатковымі. Пры вырашэнні спраў, якія тычыліся вяртання асабістых рэчаў, кампенсацыі нанесеных страт насельніцтву, было неабходна атрымаць рэзалюцыю кампетэнтных органаў беларускага або польскага бакоў, у залежнасці ад таго, хто выплочваў кампенсацыю. На сваіх пленарных пасяджэннях (раз на два тыдні) камісіі разглядалі пытанні ўстанаўлення адміністрацыйнай улады ў вёсках спрэчнай прыналежнасці, дазволаў прыгранічным жыхарам на збор ураджаю з апынуўшыхся ў замежжы палёў, выкошвання лугоў, вяртання коней і іншай жывёлы.

1 кастрычніка 1921 г. на чацвёртым пасяджэнні змешанай камісіі Полацка-Вілейскага раёна была прынята пастанова дазволіць "ўзаемна да часу правядзення канчатковай дзяржаўнай граніцы апрацоўку і засеў гаспадарчых адзінак асобам, якія маюць на тое права па законах той дзяржавы, дзе знаходзіцца гаспадарчы цэнтр" [8, арк. 86]. Пры гэтым абодва бакі гарантавалі, што збор ураджаю адбудзецца "без абкладання і адчужэння". Прадугледжвалася свабоднае перамяшчэнне ў пагранічнай паласе [8, арк. 88]. З 8 лістапада 1921 г. ЗУК прыступіла да разбору спраў, якія тычыліся задавальнення патрабаванняў па кампенсацыі страт жыхарам пагранічнай паласы, зямля якіх была не засеяна ці ўраджай з якой быў патраўлены ці ўбраны.

У сваю чаргу, беларускае савецкае кіраўніцтва ўсімі магчымымі сродкамі падтрымлівала працу ЗУК. Гэтаму сведчыць пастанова ЦВК ССРБ ад 12 кастрычніка 1921 г. "Аб правядзенні ў жыццё пастаноў змешаных узгадняльных камісій па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў з Польшчай". У ёй падкрэслівалася, што ў мэтах забеспячэння правільнай і паспяховай дзейнасці Расійска-украінска-беларуска-польскіх узгадняльных камісій прадпісвалася мясцовым, ваенным і грамадзянскім уладам ССРБ "аказваць садзейнічанне камісіям", "усе пастановы ўзгадняльных камісій у межах іх паўнамоцтваў лічыліся абавязковымі да выканання", "праводзілася тэрміновае і няхільнае ажыццяўленне ўказаных пастаноў у жыццё" [9, арк. 440].

У ЗУК з лістапада 1921 г. да чэрвеня 1922 г. паступіла больш за 35 заяў-скаргаў на незаконныя вырубкі лясных масіваў ад былых уладальнікаў так званых лясных дач, размешчаных на пагранiччы. Факты незаконнай вырубкі лясных пагранічных масіваў назіраліся на тэрыторыі Паляновічскай лясной дачы, размешчанай паміж станцыяй Коласава і Рубяжэвічамі, лясных дач памешчыка Я. Крупскага

(Нясвіжскае лясніцтва) (мал. 1) і іншых тэрыторыях [10, арк. 1]. Так, на пасяджэннях узгадняльнай Мінска-Нясвіжскай падкамісіі ў Нясвіжы 15 лютага і 7 красавіка 1922 г. з боку расійска-ўкраінска-беларускай дэлегацыі былі выказаны пратэсты супраць незаконных вырубак лясоў на тэрыторыі Нясвіжскага лясніцтва [10, арк. 2, 6].

6 лістапада 1921 г. расійска-ўкраінска-беларуская дэлегацыя Палескай падкамісіі ў Жыткавічах прасіла даслаць ёй тэрмінова спісы пацярпелых ад незаконных вырубак землеўладальнікаў Мінскай губерні [11, арк. 66–68]. З гэтай мэтай з архіваў землямерна-тэхнічнай часткі Наркамзема ССРБ была ажыццяўлена выкіпіроўка інвентароў і планаў пагранічных населеных пунктаў па Барысаўскім, Слуцкім, Мазырскім паветах, складзены спісы землеўладальнікаў былой Мінскай губерні, неабходныя “пры разглядзе пытанняў аб задавальненні розных сацыяльных груп уладальнікаў” (маёнткі Паланевічы, Вялікая Андрэеўшчына, Вялікія Пятрышкі, Траскоўшчына, Вялікія Ванячэ і Халаднікі, Асіноўка, Ісдачка, Ляхаўшчызна, Прусінава, Вялікая Старынка і шэраг засценкаў) (мал. 2) [12, арк. 2].

Яшчэ ў маі 1921 г. СНК ССРБ па папярэднім запыце ад расійска-ўкраінскай дэлегацыі ЗПК даў распараджэнне лясному аддзелу Наркамзема “прыступіць да абследвання прыгранічных лясных дач у паласе пяці вёрст ад граніцы з Польшчай, пачынаючы з поўначы на поўдзень; да збору або складання агульных планаў прыгранічнай паласы з нанясеннем даследаваных дач” [13, арк. 20]. Таксама павінны быць прадстаўлены статыстычныя звесткі




Мал. 1. Нясвіжскае лясніцтва на польскай карце (фрагмент карты Wojskowego Instytutą Geograficznego, 1922 г., 1:300 000)

Крыніца: Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. Ф. 109. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 21.

Fig. 1. The Niasviž Forestry on a Polish map (fragment of a map from the Wojskowy Instytut Geograficzny, 1922, 1:300,000)
Source: The Molodechno zonal State Archive. F. 109. Inv. 1. Case. 1. Sh. 21.




Мал. 2. Карта памежных населенных пунктаў у раёне Стоўбцаў (фрагмент карты Корпуса ваенных тапографаў РККА. Рубяжэвічы – Стоўбцы. 35-XI, 1922–1923 гг., 1:200 000)

Крыніца: Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. Ф. 40. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 3.

Fig. 2. Map of border settlements in the Stowbtsy district (fragment of a map from the Corps of Military Topographers of the Red Army. Rubiazhevichy – Stowbtsy. 35-XI, 1922–1923, 1:200,000)

Source: The State Archive of the Minsk region. F. 40. Inv. 1. Case. 10. Sh. 3.

аб дачах (воласць, лясніцтва, найменне дачы, назва былога ўладальніка, агульная і нязручная плошча лясных угоддзяў, дзеліцца ці дача граніцай, калі дзеліцца, то нявыгады такога падзелу, парода, узрост, апісанне нязручнасці ўгоддзяў, лясістасць мясцовасці, уладкавана ці дача на збыт лесу, транспартныя ўмовы, наяўнасць і месца заводаў па перапрацоўцы прадуктаў лясной гаспадаркі). Па магчымасці павінны быць таксама сабраны звесткі на захад ад граніцы на адлегласці пяці вёрст, але не пераходзячы пры гэтым пагранічнай рысы. Дадаваўся анкетны ліст і чарцёж. У выніку большасць лясніцтваў не змаглі сабраць неабходны матэрыял (адсутнасць неабходных карт, планаў, схем, знішчаных падчас ваенных ліхаліццяў, сабраць новыя звесткі за кароткі тэрмін было складана) [13, арк. 21–22].

У працэсе вырашэння дробных пагранічных інцыдэнтаў на пасяджэннях падкамісій узнікала неабходнасць выкарыстання мясцовага статыстычнага і картаграфічнага матэрыялу з фондаў землямерна-тэхнічнай часткі Наркамзема ССРБ. Так, у лістападзе 1921 г. паступіла хадатайства ад расійска-ўкраінска-беларускай Палескай узгадняльнай падкамісіі ў Жыткавічах да беларускага савецкага кіраўніцтва з просьбай аб прадстаўленні сістэматычнай 10-вярстовай карты прыгранічных паветаў і валасцей. Яны выкарыстоўваліся

пры разглядзе спрэчных пытанняў землекарыстання пагранічнай паласы, а таксама ў працэсе пераліку памераў страт, нанесеных мясцовым жыхарам па віне польскіх улад [12, арк. 14].

Усерасійскі Цэнтральны выканаўчы камітэт (УЦВК) РСФСР 19 красавіка 1922 г. паведамляў у ЦК Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б), што, па звестках НКЗС РСФСР, назіраюцца выпадкі, калі прадстаўнікі органаў савецкай улады пагранічнай паласы ў працэсе эвакуацыі аддаюць загады аб вывазе сельскагаспадарчага інвентару, вырубцы ці разрабаванні лясоў, зламанні жылых пабудоў і інш. [14, арк. 78]. Гэтыя незаконныя дзеянні выклікалі шматлікія пратэсты польскай дэлегацыі ЗУК, супрацоўнікаў Паўнамоцнага прадстаўніцтва Польшчы ў РСФСР. Факт вывазу савецкімі ўладамі сялянскай маёмасці меў месца ў пагранічнай вёсцы Шчэпкі (паблізу м. Радашковічы) (мал. 3), і адносна гэтага заяўлены пратэст польскай дэлегацыі ЗУК у НКЗС РСФСР. Прэзідыум УЦВК прасіў звярнуць на гэта сур’ёзную ўвагу і патлумачыць падведамасным органам пагранічнай паласы, што вывазу з вызваленых сяленняў падлягае толькі маёмасць і інвентар савецкіх гаспадарак, а не інвентар, які з’яўляецца маёмасцю сялян эвакуіраванага насельніцтва [14, арк. 221].

24 студзеня 1922 г. у Варшаве быў падпісаны дадатковы расійска-ўкраінска-беларуска-польскі пратакол (за БССР яго ў чарговы раз падпісаў прадстаўнік РСФСР), паводле якога ўсе нявырашаныя справы перадаваліся на разгляд новай узгадняльнай пагранічнай камісіі ў складзе прадстаўнікоў пагранічных служб абодвух бакоў. Першае пасяджэнне было прызначана на 8 лютага 1922 г. у Нясвіжы. У сакавіку 1922 г. НКЗС БССР па просьбе расійска-ўкраінска-беларускай дэлегацыі камісіі прадставіў спіс страт, нанесеных савецкім жыхарам прыгранічнай паласы па віне польскіх улад. У ім прыводзіліся падрабязнасці 50 выпадкаў крадзяжу жывёлы, затрымак збору ўраджаю, канфіскацыі зерня і інш. 3 лістапада 1922 г. былі ўнесены значныя карэктывы ў вырашэнні спрэчных пагранічных пытанняў. Зараз яны разглядаліся не на пасяджэннях змешаных камісій, а непасрэдна начальнікам пагранічнага аддзялення з савецкага боку і старастам з польскага [15, с. 149].




Мал. 3. Радашковічскае староства (фрагмент карты Wojskowego Instytutą Geograficznego, 1929, 1:100 000)
Крыніца: Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. Ф. 9. Воп. 1. Спр. 117. Арк. 51.

Fig. 3. The Radashkovichy Starostvo (fragment of a map from the Wojskowy Instytut Geograficzny, 1929, 1:100,000)
Source: The Molodechno zonal State Archive. F. 9. Inv. 1. Case. 117. Sh. 51.

**Падрыхтоўка і падпісанне савецка-польскага пагаднення па вырашэнні спрэчных пагранічных пытанняў у 1923–1925 гг.** З 1923 г. савецкі і польскі бакі займаліся выпрацоўкай пагаднення па вырашэнні спрэчных пагранічных пытанняў. У разглядзе праекта прымала ўдзел і паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР у РСФСР, тэкст двойчы ўзгадняўся з Саветам Народных Камісараў (СНК) БССР. 30 чэрвеня 1923 г. паўнамоцтвы ад БССР на перагаворы і падпісанне ад імя БССР пагаднення паміж РСФСР, УССР, БССР і Польшчай аб вырашэнні пагранічных канфліктаў былі перададзены члену Калегіі НКЗС РСФСР В. Л. Копу. Савецкі праект двухбаковай дамовы 5 верасня 1923 г. быў накіраваны НКЗС СССР на адрас Паўнамоцнага прадстаўніцтва Польшчы ў РСФСР.

У сваю чаргу, 4 чэрвеня 1923 г. паверany ў справах Польшчы ў РСФСР Р. Кноль атрымаў ад міністра замежных спраў паўнамоцтвы на падпісанне ад імя ўрада Польшчы дагавора аб урэгуляванні пагранічных інцыдэнтаў [16, ark. 75]. Аднак ён не скарыстаўся гэтымі паўнамоцтвамі. Прычыны адмовы польскага прадстаўніка ўступаць у перагаворы з савецкім бокам па гэтым пытанні ўказваюцца ў яго справаздачы ў МЗС Польшчы ад 9 чэрвеня 1923 г. Р. Кноль лічыў немэтазгодным падпісанне якога-небудзь пагаднення з савецкім бокам да таго часу, пакуль не будзе праведзена ў поўным памеры рээвакуацыя польскай маёмасці, прадугледжаная ўмовамі Рыжскага мірнага дагавора. Таму “любыя ўступкі на іх карысць, у тым ліку і заключэнне дагавораў, трэба лічыць заўчаснымі” [17, ark. 17].

Штуршком да актывізацыі савецка-польскіх перагавораў па вырашэнні пытання пагранічных канфліктаў стаў шэраг інцыдэнтаў на савецка-польскім пагранічччы, звязаных з пераходам граніцы ўзброенымі фарміраваннямі. Сярод іх можна адзначыць канфлікт у раёне станцыі Стоўбцы (мал. 4) у пачатку жніўня 1924 г. Савецкае дыверсійнае нападзенне на польскае павятовае паліцэйскае ўпраўленне, турму (дзе ўтрымліваліся палітзняволеныя, члены Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), у тым ліку С. Скульскі (С. Мартэнс), І. К. Лагіновіч), чыгуначны вакзал было праведзена намаганнямі дыверсантаў пад камандваннем С. А. Ваупшасава [18, арк. 74]. Гэтая акцыя, як і напады атрадаў К. П. Арлоўскага, А. П. Рабцэвіча, В. З. Каржа на прыгранічныя населеныя пункты, маёнткі землеўладальнікаў, польскіх чыноўнікаў, ажыццяўляліся ў рамках савецкай тактыкі “актыўнай разведкі” (так званай партызанскай барацьбы) у 1921–1925 гг. Галоўнай яе сутнасцю стала правядзенне ваенна-дыверсійных акцый на савецка-польскім пагранічччы з мэтай дэстабілізацыі ўнутранага становішча і разгортвання рэвалюцыйнага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Польскае кіраўніцтва, улічваючы масавы характар падобных нападаў, у верасні 1924 г. прыступіла да арганізацыі ўзброеных адзінак ў выглядзе Корпуса аховы пагранічча [19, s. 1–7].



Мал. 4. Чыгуначны вакзал на станцыі Стоўбцы

Крыніца: Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў. 0-091380. Фотатэка Беларускай чыгункі.

Fig. 4. Railway station in Stolbtzy

Source: The Belarusian State Archive of Film and Photographic Documents. 0-091380. Photo library of the Belarusian Railway.

З двухбаковай нотнай перапіскі 5 і 26 верасня 1924 г. становіцца зразумелым, што “ў прынцыпе польскі ўрад гатовы завяршыць заключэнне дамовы па вырашэнні пагранічных канфліктаў, якое не падпісана да гэтага часу з-за некаторых складанасцей тэхнічнага характару. Польскі ўрад звяртаў увагу на тое, што прапанаваная дамова павінна была б ахопліваць толькі спосаб урэгулявання дробных пагранічных інцыдэнтаў і ніякім чынам не адносіцца да выпадку, які моцна парушае добрасуседскія адносіны, якім стаў напад на ст. Стоўбцы. Калі ж урад СССР жадае пашырыць рамкі дамовы такім чынам, каб яна ахоплівала таксама пытанні сумесных дзеянняў абодвух дзяржаў у адносінах барацьбы з бандытызмам

на агульнай граніцы, то польскі ўрад разглядзеў б(ы) такую прапанову з поўнай ўвагай і добразычлівасцю” [20, с. 443–444].

5 верасня 1924 г. у ноце В. Л. Копа, члена Калегіі НКЗС СССР, паверанаму ў справах Польшчы ў СССР К. Вышынскаму указвалася аб правядзенні расследавання савецкім бокам гэтай справы. У ім адвяргаўся факт пераходу польскай граніцы бандытамі з тэрыторыі СССР са спасылкай на матэрыялы допыту чыноўнікаў пагранічнай варты, якія неслі каравульную службу з 3 на 4 жніўня 1924 г. “Нападзенне на ст. Стоўбцы не з’яўляецца адзінкавым фактам, пераход на тэрыторыю Польшчы банд адбываецца штодзённа, гэта нельга пацвердзіць якімі-небудзь дастатковымі звесткамі” [21, с. 282].

У сваю чаргу, В. Л. Коп звяртаў увагу на сістэматычны пераход банд з польскага боку на тэрыторыю СССР у Беларусі (банды С. Паўлоўскага, Ц. Караткевіча, М. Жылінскага, Г. Моніча). Савецкі прадстаўнік настойваў на хуткім заключэнні дагавора па вырашэнні пагранічных канфліктаў, “ужо распрацаванага і не падпісанага выключна па жаданні польскага боку” [21, с. 335].

21 кастрычніка 1924 г. была накіравана нота НКЗС СССР паверанаму ў справах Польшчы ў СССР К. Вышынскаму ў сувязі з пераходам у ноч з 1 на 2 кастрычніка 1924 г. узброенай банды (складалася з 15–20 чалавек) з тэрыторыі Польшчы на савецкую тэрыторыю ў раёне Рубяжэвіч (мал. 5). 17 лістапада 1924 г. паступіла нота ў адказ [22, арк. 30].

Аналагічным выпадкам парушэння аховы савецка-польскай граніцы стаў “ямпальскі” інцыдэнт 5 студзеня 1925 г. Незаконны пераход у раёне в. Сіўкі, каля Ямпаля (Валынскі павет), групы асоб у польскай форме і са зброяй польскага ўзору выклікала пратэст з боку савецкага кіраўніцтва.

Падчас шматлікіх сустрэч прадстаўнікоў НКЗС СССР і членаў Паўнамоцнага прадстаўніцтва Польшчы ў СССР неаднаразова ўздымалася пытанне заключэння двухбаковай дамовы па вырашэнні пагранічных канфліктных сітуацый. Імкненне савецкага боку да падпісання такога дакумента ўказвалася ў дакладзе “Аб знешняй палітыцы Савецкага ўрада: пытанне аб савецка-польскіх адносінах” народнага камісара замежных спраў СССР Г. В. Чычэрына. Ён быў агучаны на пасяджэнні III сесіі ЦВК СССР 3 сакавіка 1925 г. [21, с. 380].

У сярэдзіне 1920-х гг. адбыліся пэўныя змены ў знешнепалітычнай лініі Польшчы і СССР адносна Заходняй Беларусі. У савецкім кіраўніцтве яны былі звязаны з пераарыентацыяй на пабудову сацыялізму ў адной краіне, што патрабавала падтрымкі добрасуседскіх міждзяржаўных адносін з капіталістычнымі дзяржавамі. Ад гэтага залежала развіццё гандлёва-эканамічных сувязей, без якіх справа аднаўлення і развіцця савецкай эканомікі станавілася амаль невыканальнай. 25 лютага 1925 г. на пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП(б) было прынята рашэнне аб згортванні палітыкі “актыўнай разведкі” у адносінах да суседніх дзяржаў [23, с. 12–15].

Пагадненне па вырашэнні пагранічных канфліктаў паміж урадамі СССР і Польшчы было заключана 3 жніўня 1925 г. у Маскве. Яго падпісалі член Калегіі НКЗС СССР С. І. Аралаў



Мал. 5. Рубяжэвічы. Фатаграфія. 1930-я гг.

Крыніца: Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў 0-141389. Фотатэка калекцыянера М. А. Чарняўскага.

Fig. 5. Rubezhevichi. Photo. 1930s

Source: The Belarusian State Archive of Film and Photographic Documents. 0-141389. Photo library of the collector M. A. Chernyavsky.

і паўнамоцны прадстаўнік Польшчы ў СССР С. Кентшыньскі. Усе дробныя пагранічныя канфлікты гаспадарча-бытавога характару (адзінкавыя абстрэлы асоб пагранічнай аховы і тэрыторыі без забітых і параненых, матэрыяльных страт; вяртанне жывёлы, зварот скрадзенай маёмасці, ненаўмысны пераход граніцы мясцовым насельніцтвам ці пагранічнай аховай) вырашаліся на месцы начальнікам пагранічнага атрада АДПУ СССР і старастам адпаведнага павета Польшчы ці ўпаўнаважанымі асобамі. Калі яны не маглі вырашыць праблему самастойна, спрэчка перадавалася на разгляд у НКЗС СССР і МЗС Польшчы. Пастановы аб звароце людзей, жывёлы, рэчаў з'яўляліся канчатковымі, а аб матэрыяльнай кампенсацыі нанесеных страт – зацвярджаліся НКЗС СССР і МЗС Польшчы. На ўчастках вызначаліся пераходна-кантрольныя пункты, дзе адбываўся абмен лістамі, выдача жывёлы.

25 жніўня 1925 г. быў дадаткова падпісаны так званы ямпальскі пратакол аб узаемадапамозе пры ліквідацыі банд [22, арк. 11]. У 1925 г. у адпаведнасці з пагадненнем пачалі дзейнічаць лакальныя савецка-польскія камісіі па вырашэнні пагранічных канфліктаў. На цэнтральным участку савецка-польскай граніцы з беларускага боку камісію ўзначаліў начальнік 16-га пагранічнага атрада, з польскага – служачы Стаўбцоўскага староства. Бакі дамовіліся абмяняцца захопленай зброяй, узгаднілі час персанальнага абмену перабежчыкамі, прызначылі пункты абмену людзьмі, жывёлай і рэчамі [22, арк. 18].

Адзначанае пагадненне значна аблегчыла становішча ў савецка-польскім пагранічны. На гэты факт указваецца і ў размове намесніка народнага камісара замежных спраў СССР Л. М. Карахана з паўнамоцным прадстаўнікам Польшчы ў СССР С. Патэкам 4 жніўня 1931 г. [21, с. 490–491]. С. Патэк з задавальненнем адзначаў, што "пагранічныя камісіі на месцы ўладжваюць цэлы шэраг непаразуменняў. У час, калі была заключана дамова, у першы ж месяц 10–20 % працы пасольства перайшло ў адпаведныя камісіі, зараз амаль 75 % пагранічных пытанняў рэгулююцца на месцы" [21, с. 491]. У сваю чаргу, савецкі бок не быў задаволены эфектыўнасцю працы змешаных узгадняльных камісій. Падчас сустрэчы С. Патэка і М. М. Літвінава 16 снежня 1931 г. народны камісар замежных спраў СССР указваў, што абсалютная большасць спраў, якія паступаюць у камісіі, застаюцца без станоўчага вырашэння [24, s. 640].

**Заключэнне Дамовы аб прававых адносінах на дзяржаўнай мяжы і канвенцыі аб парадку расследвання і вырашэння пагранічных канфліктаў.** У пачатку 1930-х гг. у савецкай знешняй палітыцы адбыўся паварот у бок збліжэння з краінамі Версальскай сістэмы. Пачалася планамерная падрыхтоўка да заключэння Дагавора аб ненападзенні з Польшчай. Яшчэ ў ноце ад 29 снежня 1928 г. часова выконваючага абавязкі народнага камісара замежных спраў СССР М. М. Літвінава пасланніку Польшчы ў Маскве С. Патэку была выказана прапанова падпісаць пратакол аб датэрміновым увядзенні ў дзеянне пакта Брыяна – Келага (ці Парыжскі пакт – дагавор аб адмове ад вайны ў якасці сродка знешняй палітыкі. Атрымаў назву па імёнах ініцыятараў – міністра замежных спраў Францыі Арыстыда Брыяна і дзяржсакратара ЗША Фрэнка Келлага. – *В. Б.*) паміж Польшчай і СССР [25, с. 45–47]. На пасяджэнні Палітбюро ЦК УКП(б) 25 студзеня 1930 г. абмяркоўвалася пытанне паляпшэння савецка-польскіх адносін. Было вырашана ўказаць паўнамоцнаму прадстаўніку ў Варшаве "будаваць свае адносіны з польскім Міністэрствам замежных спраў, зыходзячы з таго, што ў дадзены момант мы не зацікаўлены ў абвастрэнні адносін з палякамі" [23, с. 55].

10 красавіка 1932 г. была заключана Дамова паміж СССР і Польскай Рэспублікай аб прававых адносінах на дзяржаўнай граніцы тэрмінам на 5 гадоў. Яе падпісалі член Калегіі НКЗС Б. С. Стаманякоў і загадчык I Заходняга аддзела НКЗС СССР М. Я. Райвід, з аднаго боку, і У. Расінскі, з другога. Згодна з артыкулам III бакі дамаўляліся прыняць "меры да належнай аховы пагранічных знакаў, якія вызначаюць лінію дзяржаўнай граніцы паміж СССР і Польскай Рэспублікай (пагранічныя слупы, капцы, ірвы і іншыя збудаванні)", не дапускаць "іх наўмыснага знішчэння ці пашкоджання, а таксама рэк і ручаёў і самавольнай пабудовы водных збудаванняў па берагах пагранічных рэк і ручаёў", а таксама "будуць прыцягваць да адказнасці па сваіх асабістых законах асоб, вінoўных у знішчэнні ці пашкоджанні пагранічных знакаў" [25, с. 52]. Для вырашэння спрэчных пытанняў прадугледжвалася стварэнне змешаных камісій з ліку служачых пагранічнай аховы. Праблемы, адносна якіх немагчыма

будзе дасягнуць дамоўленасці адзначаным шляхам, павінны перадавацца на вырашэнне дыпламатычным шляхам.

Заключэнне 25 ліпеня 1932 г. Дагавора аб ненападзенні зняло з павесткі дня савецка-польскіх адносін праблематыку выканання VII артыкула Рыжскага мірнага дагавора. Савецкае кіраўніцтва было запэўнена ў тым, што Польшча прызнае законнасць савецка-польскай граніцы, не будзе падвяргаць яе рэвізіі і адмовіцца ад ідэі выкарыстання супраць СССР беларускага і ўкраінскага пытанняў. У сваю чаргу, СССР гарантаваў непарушнасць Рыжскага міру і ўсталяванай ім граніцы. Больш за тое, дагавор паўплываў на агульную лінію савецкага боку ў адносінах да Заходняй Беларусі. Савецкі ўрад, падпісваючы дагавор, як бы заяўляў аб тым, што ў бліжэйшы час не будзе выкарыстоўваць нацыянальных рух у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне для спроб развалу Польскай дзяржавы. Для польскага кіраўніцтва сведчаннем новай пазіцыі СССР былі пачатыя рэпрэсіі супраць дзеячаў беларускага і ўкраінскага нацыянальнага руху, адмова ў 1931 г. Камуністычнай партыі Польшчы, КПЗБ і Камуністычнай партыі Заходняй Украіны ад іх праграмнай мэты далучэння Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да БССР і УССР у выніку нацыянальна-вызваленчай барацьбы. З боку Польшчы падпісанне дагавора было сведчаннем таго, што яе актыўная палітыка ў “міжмор'і”, уздоўж заходніх граніц СССР, не мае на мэце стварэння агрэсіўнага антысавецкага блока.

23 лістапада 1932 г. была заключана Канвенцыя аб узгадняльнай працэдуры паміж Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Польскай Рэспублікай як дадатак да Дагавора аб ненападзенні. Згодна з ёй бакі для дасягнення ўзаемнай дамовы бралі на сябе абавязак перадаваць ва ўзгадняльную камісію, у складзе трох членаў ад кожнага боку, любыя магчымыя спрэчныя пытанні, якія могуць узнікнуць паміж СССР і Польшчай. У тым ліку гэта тычылася і вырашэння праблемы пагранічных канфліктаў [26, s. 40–41].

3 чэрвеня 1933 г. у Мінску была падпісана канвенцыя паміж СССР (в. а. народнага камісара замежных спраў М. М. Красцінскі) і Польшчай (польскі пасол Ю. Лукасевіч) аб парадку расследвання і вырашэння пагранічных канфліктаў. Гэта канвенцыя была выпрацавана з улікам вопыту ўзаемаадносін на савецка-польскай граніцы і фактычна замяняла пагадненне ад 1925 г. У 1936 г. у канвенцыю 1933 г. аб парадку расследвання і вырашэння пагранічных інцыдэнтаў былі ўнесены змены адносна межаў пагранічных раёнаў і паўнамоцтваў прадстаўнікоў па пагранічных справах СССР [25, с. 105].

9 чэрвеня 1933 г. паўнамоцным прадстаўніком СССР у Польшчы У. А. Антонавым-Аўсеенкам і міністрам замежных спраў Польшчы Ю. Бэкам была падпісана Канвенцыя паміж СССР і Польскай Рэспублікай аб сплаве лясных матэрыялаў па пагранічных рэках [27, арк. 8–10]. 27 верасня 1933 г. яна была ратыфікавана ЦВК СССР, а 5 сакавіка 1934 г. – польскім урадам. Абмен ратыфікацыйнымі граматамі адбыўся ў Маскве 5 чэрвеня 1934 г. Пастановы канвенцыі былі датэрмінова ўведзены ў дзеянне згодна з абменам нотамі ад 19 чэрвеня 1933 г. паміж Паўнамоцным прадстаўніком СССР у Польшчы і міністрам замежных спраў Польшчы. 9 ліпеня 1933 г. быў падпісаны пратакол да Канвенцыі аб сплаве лесаматэрыялаў па пагранічных рэках. Ратыфікаваны ён быў, як і канвенцыя, 27 верасня 1933 г. Абмен граматамі адбыўся ў Маскве 5 чэрвеня 1934 г.

Згодна з Канвенцыяй прадугледжвалася, што сплаў лесу па рэках Случ, Морач, Вілія, Ілія, Нёман, Дзвінаса, Заходняя Дзвіна праводзіцца з 16 ліпеня 1933 г. Пры гэтым усе аперацыі павінны праходзіць у дзённы час, на ноч плыты павінны спыняцца на стаянку. Кожны сплаўшчык або караваншчык павінен мець пасведчанне асобы з візай пагранічнай аховы [28, арк. 1]. Згодна з артыкулам 17 Канвенцыі ўсе пытанні па ўрэгуляванні пуску і сплаву драўніны, а роўна і мерапрыемстваў па нармальным праходжанні сплаўнай кампаніі па пагранічных рэках, а таксама па парушэнні якім-небудзь бокам артыкулаў канвенцыі ажыццяўляліся камендантамі пагранічнага атрада, на тэрыторыі якога праводзіўся сплаў [28, арк. 42].

## Заключэнне

Такім чынам, вырашэнне праблемы ўзнікнення рознага шэрага пагранічных інцыдэнтаў з'яўлялася надзённым пытаннем у савецка-польскіх адносінах 1921–1933 гг. Абодва бакі былі зацікаўлены ў стварэнні дзейснага механізма ліквідацыі канфліктаў на дзяржаўнай граніцы, прадухіленні ўзнікнення новых спрэчных выпадкаў, у тым ліку звязаных з існаваннем і функцыянаваннем бандыцкіх груповак. У перыяд 1921–1925 гг., да моманту заключэння двухбаковага пагаднення, сітуацыя адрознівалася надзвычайнай вастрынёй, актывізацыяй бандыцкіх нападаў на пагранічныя заставы і населеныя пункты. Вырашэнню пытання ў першую чаргу перашкаджала пазіцыя польскага кіраўніцтва, якое ўрэгуляванне гэтай праблемы ставіла ў залежнасць ад працэсу практычнага выканання ўмоў Рыжскага мірнага дагавора (у прыватнасці артыкулаў аб рээвакуацыі маёмасці і рэстытуцыі культурнай спадчыны). У 1925–1933 гг. абодва бакі імкнуліся, шляхам падрыхтоўкі і заключэння адпаведнага пагаднення і наступных яго ўдакладненняў, знайсці аптымальны шлях вырашэння пагранічных спрэчак.

## Спіс бібліяграфічных спасылак


1. Ольшанский, П. Н. *Рижский договор и развитие советско-польских отношений. 1921–1924 гг.* / П. Н. Ольшанский. – Москва : Наука, 1974. – 286 с.
2. Kumaniecki, J. *Pokój polsko-radziecki 1921. Geneza – rokowania – traktat – komisje mieszane* / J. Kumaniecki. – Warszawa : Biblioteka Narodowa, 1985. – 240 s.
3. Kowalski, Z. G. Granica Ryska / Z. G. Kowalski // *Traktat Ryski 1921 roku po 75 latach* / pod red. M. Wojciechowskiego. – Toruń : wydawnictwo Uniwersitetu M. Kopernika, 1998. – S. 127–139.
4. Poczobut, A. Granica Ryska: przebieg, demarkacja i reakcja ludności na jej ustanowienie / A. Poczobut // *Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku* / pod red. T. Gawina. – Warszawa : Uniwersytet Warszawski, 2020. – S. 279–289.
5. Wasilewski, A. *Granica lorda Curzona: polska granica wschodnia, przejscia graniczne, podrozni, wiry* / A. Wasilewski. – Toruń : Adam marzalek, 2003. – 210 s.
6. Хомич, С. Н. *Территория и государственные границы Беларуси в ХХ веке : от незавершенной этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo* / С. Н. Хомич. – Минск : Экономпресс, 2011. – 416 с.
7. Кузьмич, В. Н. *Белорусский участок советско-польской границы: становление и функционирование в 1921–1939 гг.* : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / В. Н. Кузьмич ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Минск, 2011. – 24 с.
8. *Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ).* – Ф. 48. Народны камісарыят земляробства БССР. Воп. 1. Спр. 288. Перапіска з установамі БССР аб парадку правядзення сельскагаспадарчых прац у пагранічнай паласе, экспарце сельскагаспадарчых тавараў за граніцу і па іншых пытаннях сельскай гаспадаркі. – 3 студзеня 1921 г. – 30 студзеня 1922 г. – 142 арк.
9. *НАРБ.* – Ф. 6. Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР. – Воп. 1. – Спр. 9. Пратаколы пасяджэнняў ЦВК і СНК БССР, апісанне дзяржаўнай граніцы паміж Расіяй і Украінай з аднаго боку і Польшчай з другога (па карце 3 вярсты ў цалі. Расійскае выданне). – 5 студзеня – 30 снежня 1921 г. – 619 арк.
10. *НАРБ.* – Ф. 48. – Воп. 1. – Спр. 1569. Акты і перапіска з Наркамземам БССР і лясніцтвамі аб парубках леса сялянамі Польшчы ў памежных лясніцтвах БССР, ацэначныя ведамасці лесасек. – 21 сакавіка 1922 г. – 24 мая 1923 г. – 123 арк.
11. *НАРБ.* – Ф. 48. – Воп. 1. – Спр. 1095. Цыркуляры Наркамзема БССР аб землеўладкаванні, пратакол нарады землямераў-землеўладкавальнікаў і загадчыкаў пададдзеламі землеўладкавання ад 7 мая 1921 г. і рэзалюцыя нарады; пратакол нарады землямераў-землеўладкавальнікаў Бабруйскага павета, спіс землеўладальнікаў Мінскай губ., якія пражываюць у пагранічнай паласе, часовае палажэнне і штаты ўпраўлення землеўладкавання і інш. – 19 сакавіка 1921 г. – 28 снежня 1921 г. – 91 арк.
12. *НАРБ.* – Ф. 48. – Воп. 1. – Спр. 1103. Перапіска з руска-ўкраінска-польскай змешанай пагранічнай камісіяй аб складанні зямельных планаў і карт пагранічных пунктаў. – 6 чэрвеня 1921 г. – 14 лістапада 1921 г. – 18 арк.
13. *НАРБ.* – Ф. 48. – Воп. 1. – Спр. 231. Матэрыялы для працы пагранічнай камісіі пры правядзенні граніцы паміж БССР і Польшчай (апісанне граніцы БССР па Рыжскім мірным дагаворы і пагранічных лясных дач, спісы пагранічных вёсак па паветах і інш.). – Май – ліпень 1921 г. – 125 арк.
14. *НАРБ.* – Ф. 6. – Воп. 1. – Спр. 13. Пастановы і пратаколы СНК БССР, цыркуляры і перапіска ЦВК і СНК БССР з народнымі камісарыятамі, установамі і павятовымі выканаўчымі камітэтамі, пратаколы пасяджэнняў ЦВК саюзных рэспублік. – 22 верасня 1921 г. – 16 мая 1922 г. – 228 арк.
15. *Знешняя палітыка Беларусі : у 10 т.* / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 1997–2010. – Т. 1 : 1917–1922 гг. / склад.: У. М. Міхнюк [і інш.]. – 1997. – 395 с.

16. *Archiwum Akt Nowych* (AAN). – Z. 309. Ministerstwo spraw zagranicznych. – Sygn. 261. T. 2. Korespondencja ambasadora RP w ZSRR i Ministerstwa Spraw Zagranicznych RP. – 1922–1926. – 156 ark.
17. *AAN*. – Z. 309. – Sygn. 1. Raport ambasadora RP w ZSRR. – 1923–1924. – 56 ark.
18. *НАРБ*. – Ф. 976. Асабісты фонд Арэхвы Мікалая Сямёнавіча. – Воп. 1. – Спр. 72. Арэхва М. С. Справы і людзі КПЗБ. Успаміны. Частка I–III. – 1983. – 182 арк.
19. Minkiewicz, H. *Korpus Ochrony Pogranicza w pierwszą rocznicę objęcia służby na wschodniej granicy Rzeczypospolitej 1924–1925* / H. Minkiewicz. – Warszawa : Ministerstwo spraw wojskowych PR, 1925. – 57 s.
20. *Документы внешней политики СССР : в 24 т.* / редкол.: Г. К. Деев [и др.]. – Москва : Госполитиздат, 1959–2016. – Т. 7 : 1 января – 31 декабря 1924 г. – 1963. – 740 с.
21. *Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т.* / Ин-т славяноведения АН СССР, Ин-т истории польско-советских отношений Польской АН ; отв. ред. И. А. Хренов, Т. Цесляк. – Москва : Наука, 1963–1974. – Т. 4 : апрель 1921 г. – май 1926 г. – 1966. – 562 с.
22. *НАРБ*. – Ф. 4п. Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 1965. План работы палітінспекцыі часткі пагранаховы паўнамоцнага прадстаўніка АДПУ па Заходнім краі на лістапад – снежань 1924 г., выпіска з інфармацыйнай зводкі ДПУ БССР ад 16 снежня 1924 г., данясенне палітінспекцыі надзвычайнага прадстаўніка Паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па Заходнім краі ад 1 лістапада 1924 г. – 29 мая 1924 г. – 10 снежня 1925 г. – 71 арк.
23. *Материалы «Особой папки» Политбюро ЦК РКП(б) – УКП(б) по вопросу советско-польских отношений. 1923–1944 гг.* / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения и балканистики, Рос. центр хранения и изучения док. новейшей истории, Науч. центр общеславян. исслед. – Москва : [Б. и.], 1997. – 144 с.
24. *Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945* / red. serii M. Wołos: w IV t. Warszawa: Centrum polsko-rosyjskiego dyalogu i porozumienia, 2020–2025. – T. II : 1926–1932. – Cz. 2 : Na drodze ku stabilizacji (luty 1929 – lipiec 1932). – 2022. – 950 s.
25. *Знешняя палітыка Беларусі : у 10 т.* / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]. – Мінск : БелНДІДАС, 1997– 2010. – Т. 3 : 1928–1941 гг. / склад.: У. М. Міхнюк [і інш.]. – 1999.– 331 с.
26. *Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945* / red. serii M. Wołos: w IV t. Warszawa: Centrum polsko-rosyjskiego dyalogu i porozumienia, 2020–2025. – T. III : 1932–1939. – Cz. 1 : Zbliżenie i rozejście sié dróg (lipiec 1932 – maj 1935). – 2024. – 854 s.
27. *Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі.* – Ф. 188. Калегія Народнага камісарыята замежных спраў СССР. – Воп. 7. – Спр. 28. Дакументы аб адносінах з польскімі прадстаўнікамі адносна заключэння пагранічных канвенцый. – Люты 1925 г. – май 1936 г. – 135 арк.
28. *НАРБ*. – Ф. 152. Беларуская сплаўная кантора Дзяржаўнага трэста лесаэксплуатацыі і лясной гаспадаркі “Лесбел”. – Воп. 1. – Спр. 36. Звесткі аб выкананні фінансавага плана. – 1933 г. – 60 арк.

## References

1. Ol’shanskij P. N. *Rizskij dogovor i razvitie sovetsko-polskich otnishenij. 1921–1924 gg.* [The Riga Treaty and the development of Soviet-Polish relations. 1921–1924]. Moskow : Nauka, 1974. 286 p. Russian.
2. Kumaniecki J. *Pokój polsko-radziecki 1921. Geneza–rokowania–traktat–komisje mieszane.* Warszawa : Biblioteka Narodowa, 1985. 240 s. Polish.
3. Kowalski Z. G. Granica Ryska. In: Wojciechowskij M. (edit). *Traktat Ryski 1921 roku po 75 latach.* Toruń : wydawnictwo Uniwersitetu M. Kopernika, 1998. S. 127–139. Polish.
4. Poczobut A. Granica Ryska: przebieg, demarkacja i reakcja ludności na jej ustanowienie. In: Gawina T. (edit.). *Polacy na Białorisi od końca XIX do początku XXI wieku.* Warszawa : Uniwersytet Warszawski, 2020. S. 279–289. Polish.
5. Wasilewski A. *Granica lorda Curzona: polska granica wschodnia, przejscia graniczne, podrozni, wiry.* Toruń : Adam marzalek, 2003. 210 s. Polish.
6. Khomich S. N. *Territoriya i gosudarstvennyye granitsy Belarusi v XX veke: ot nezavershennoy etnicheskoy samoidentifikatsii i vneshnepoliticheskogo proizvola k sovremennomu status guo* [The territory and state borders of Belarus in the twentieth century: from incomplete ethnic identity and foreign policy arbitrariness to the modern status quo]. Minsk : Econompress, 2011. 461 p. Rissian.
7. Kuz’mich V. N. *Belorusskij uczastok sovetsko-polskoj granicy: stanovlenie i funkcyonirovanie v 1921–1939 gg.* [The Belarusian section of the Soviet-Polish border: formation and functioning in 1921–1939] : [dissertation abstract]. Minsk : Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, 2011. 24 p. Russian.
8. *National’nyj archive Respubliki Belarus’* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 48. People’s Commissariat of Agriculture of the BSSR. Inv. 1. Case 288. Correspondence with the institutions of the BSSR on the regulation of agricultural work in the border zone, the export of agricultural goods abroad and other agricultural issues. January 3, 1921 – January 30, 1922. 142 p. Belarusian.
9. *National’nyj archive Respubliki Belarus’* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 6. Central Executive Committee of the BSSR. Inv. 1. Case 9. Minutes of meetings of the Central Election Commission and the Council of People’s Commissars of the BSSR, a description of the state border between Russia and Ukraine on the one hand and Poland on the other (according to the map 3 versts in inches. Russian edition). January 5 – December 30, 1921. 691 p. Belarusian.

10. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 48. Inv. 1. Case 1569. Acts and correspondence with the People's Commissariat of Agriculture of the BSSR and forestry departments on logging by Polish peasants in the border forestry departments of the BSSR, assessment reports of logging sites. March 21, 1922 – May 24, 1923. 123 p. Belarusian.
11. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 48. Inv. 1. Case 1095. Circulars of the People's Commissariat of Land Management of the BSSR, minutes of the meeting of land surveyors and heads of sub-departments of land management dated May 7, 1921 and the resolution of the meeting; minutes of the meeting of land surveyors of the Bobruisk district, a list of landowners of the Minsk province living in the border zone, the temporary situation and staff of land management, etc. March 19, 1921 – December 28, 1921. 91 p. Belarusian.
12. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 48. Inv. 1. Case 1103. Correspondence with the Russian-Ukrainian-Polish Mixed Border Commission on the preparation of land plans and maps of border posts. June 6, 1921 – November 14, 1921. 18 p. Belarusian.
13. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 48. Inv. 1. Case 231. Materials for the work of the border commission in drawing the border between the BSSR and Poland (description of the border of the BSSR under the Riga Peace Treaty and border forest cottages, lists of border villages by county, etc.). May – July 1921. 125 p. Belarusian.
14. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 6. Inv. 1. Case 13. Resolutions and protocols of the Council of People's Commissars of the BSSR, circulars and correspondence of the Central Executive Committee and the Council of People's Commissars of the BSSR with People's commissariats, institutions and county executive committees, minutes of meetings of the Central Executive Committee of the Union Republics. September 22, 1921 – May 16, 1922. 228 p. Belarusian.
15. *Zneshnja palityka Belarusi: zb. dak. i mat. : v 10 t.* [Foreign policy of Belarus: collection of documents. and materials: in 10 vol.]. Minsk : BelNDIDAS, 1997. Vol. 1 : 1917–1922 gg. 398 p. Belarusian.
16. *Archiwum Akt Nowych* [Archive Of New Files]. F. 309. Ministry of Foreign Affairs. Case 261. Vol. 2. Correspondence of the ambassador of the Republic of Poland to the USSR and the Ministry of Foreign Affairs of the Republic of Poland. 1922–1926. 156 p. Polish.
17. *Archiwum Akt Nowych* [Archive Of New Files]. F. 309. Case 1. Report of the ambassador of the Republic of Poland to the USSR. 1923–1924. 56 p. Polish.
18. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 976. The Personal Fund of Nikolai Semenovich Orekhva. Inv. 1. Case 72. Orekhva M. S. the affairs and people of the KPZB. Memories. Part I–III. 1983. 182 p. Russian.
19. Minkiewicz H. *Korpus Ochrony Pogranicza w pierwszą rocznicę objęcia służby na wschodniej granicy Rzeczypospolitej 1924–1925.* Warszawa : Ministerstwo spraw wojskowych PR, 1925. 57 s. Polish.
20. *Dokumenty vneshnej politiki SSSR : w 24 t.* [Documents of the USSR foreign policy: in 24 vol.]. Vol. 7 : January 1 – December 31, 1924. Moskow : Gospolitizdat, 1963. 761 p. Russian.
21. Vronskij S. (edit.). *Dokumenty i materialy po istorii sovetsko-polskich otnoshenij : v 11 t.* [Documents and materials on the history of Soviet-Polish relations : in 11 vol.]. Vol. 4 : April 1921 – May 1926. Moskow : Nauka, 1966. 562 p. Russian.
22. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 4p. Central Committee of the Communist Party of Belarus. Inv. 1. Case 1965. Work plan of the political inspectorate of the border guard unit of the OGPU plenipotentiary representative for the western region for November – December 1924, Extract from the information bulletin of the GPU of the BSSR dated December 16, 1924, report of the political inspectorate of the extraordinary representative of the Plenipotentiary Representation of the United State Political Administration for the Western territory dated November 1, 1924. May 29, 1924 – December 10, 1925. 71 p. Russian.
23. *Materialy "Osoboj papki" Politburo CK RKP(b) – UKP (b) po voprosu sovetsko-pol'skich otnoszenij. 1923–1924 gg.* [Materials from the Special Folder of the Politburo of the Central Committee of the Russian Communist Party (Bolsheviks) and the Ukrainian Communist Party (Bolsheviks) on Soviet-Polish relations. 1923–1944]. Moskow : [without a publisher], 1997. 144 p. Russian.
24. Wołos M. (edit.). *Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945 : w IV t. T. II : 1926–1932. Cz. 2 : Na drodze ku stabilizacji (luty 1929 – lipiec 1932).* Warszawa : Centrum polsko-rosyjskiego dialogu i porozumienia, 2020–2025, 2022. 950 s. Polish.
25. *Zneshnja palityka Belarusi: zb. dak. i mat. : v 10 t.* [Foreign policy of Belarus: collection of documents. and materials: in 10 vol.]. Vol. 3 : 1928–1941 gg. Minsk : BelNDIDAS, 1997. 321 p. Belarusian.
26. Wołos M., edit. *Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945 : w IV t. T. III : 1932–1939. Cz. 1 : Zbliżenie i rozejście sié dróg (lipiec 1932 – maj 1935).* Warszawa : Centrum polsko-rosyjskiego dialogu i porozumienia, 2020–2025. 2024. 854 s. Polish.
27. *Archiu znesznjaj palityki Rasijskaj Federacyi* [Archive of the Foreign Policy of the Russian Federation]. F. 188. Board of the People's Commissariat of Foreign Affairs of the USSR. Inv. 7. Case 28. Documents on relations with Polish representatives regarding the conclusion of border conventions. February 1925 – May 1936. 135 p. Russian.
28. *National'nyj archive Respubliki Belarus'* [The National Archive of the Republic of Belarus]. F. 152. Belarusian Rafting Office of the State Forest Exploitation and Forestry Trust "Lesbel". Inv. 1. Case 36. Information about the implementation of the financial plan. 1933. 60 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 10.05.2025*
*Received by editorial board 10.05.2025*